**У Вас засталіся 2 дні, каб падпісацца на «Народную Волю» на другое паўгоддзе. На пошту!**


# Народная Воля

**№№93–94 (3430–3431)**

24—27 чэрвеня 2011 г.

Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец: УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.


**Да ўвагі!**
*Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!*

АКЦЫЯ




**Здымак, які быў зроблены ў момант спробы затрымання другога сакратара пасольства Швецыі Дэвіда Эмтэстама падчас акцыі "Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі", ужо абляцеў увесь свет…**

# Апладысменты перараслі ў авацыі

*"Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі" павялічвае геаграфію і колькасць удзельнікаў. Улады пасля акцыі 15 чэрвеня зрабілі "працу над памылкамі" і 22 чэрвеня паспрабавалі прадухіліць масавыя гулянні ў цэнтры сталіцы. Хацелі, як лепш, а атрымалася...*

## У аўтазак паляцеў ровар, а потым і хлопец...

У Мінску, дзякуючы міліцыі, акцыя пачалася ледзь не за гадзіну да яе правядзення. У 18.15 людзей не пускалі ў метро на станцыі "Кастрычніцкая" і "Купалаўская". Аўтобус №100 не спыняўся на Кастрычніцкай плошчы.

Гэтым разам міліцыя ачапіла па перыметры сквер каля Купалаўскага тэатра, каб там не маглі сабрацца ўдзельнікі акцыі.

Людзі, якія менавіта ў гэты час дабіраліся з працы дадому, вымушаны былі ісці пехатою да наступнага прыпынку. У выніку на праспекце Незалежнасці ўтварыліся калоны пешаходаў, якія хутчэй нагадвалі дэманстрацыю. Пры гэтым у калоны час ад часу ўкліньваліся спецназаўцы ў чорным, групы міліцыянераў у форме і людзі ў цывільным з рацыямі. Некаторых маладых людзей пачалі хапаць і закідваць у аўтобусы.

Тым часам на праспекце значна паменела транспарту. Міліцыянеры адным журналістам адказвалі, што зараз будуць фарбаваць разметку, другім — што будуць усталёўваць святочную ілюмінацыю. У 19.00, як па камандзе, спецназаўцы наляглі ланцугом на людзей, выціскаючы іх у розныя бакі, тыя пачалі пляскаць у далоні і тупаць нагамі, а кіроўцы націснулі на клаксоны.

Па міліцэйскіх рацыях разнеслася: *"Кто дернется, хватайте за шкирку — и в машину!"* А вось і машына. Да ўніверсама "Цэнтральны" пад'ехаў аўтазак. Спецназаўцы пачалі хапаць тых, хто быў да іх бліжэй у натоўпе. Схапілі хлопца на ровары. Спачатку ў аўтазак паляцеў ровар, а потым і юнак. Там яго "прынялі" два спецназаўцы з дубінкамі. Можна лёгка ўявіць, што там потым адбывалася. Спецназавец, калі першы раз ударыў хлопца, стаяў ва ўвесь рост, а другі раз — нахіліўшыся да падлогі. Так было з кожным.

Нейкі час людзям не дазвалялі падняцца і сесці на сядзенне. Роднага брата вядомага драматурга, кіраўніка "Свабоднага тэатра" **Мікалая Халезіна Юрыя Халезіна**, **Паўла Кудзелку** (які, дарэчы, не быў удзельнікам акцыі і нічога пра яе не ведаў) і **Уладзіміра Шульгу** трымалі на падлозе, калі везлі ў міліцыю і калі потым везлі ў ІЧУ на Акрэсціна.

## «Вам, журналістам, нічога і не трэба бачыць!»

Асабліва нервавалі міліцыю журналісты, перш за ўсё тыя, якія мелі пры сабе камеры. Першым, яшчэ да пачатку акцыі, у аўтобус трапіў **карэспандэнт Радыё Свабода Алег Груздзіловіч**. Прадстаўнік прэс-службы міліцыі звярнуўся да журналістаў і прапанаваў ім стаць за домам на вуліцы Энгельса. На заўвагу, што ім адтуль нічога не будзе бачна, адказаў вельмі проста і шчыра: *"А вам нічога і не трэба бачыць".*

Яскравым прыкладам стаўлення ўлад да прадстаўнікоў СМІ стаў факт затрымання яшчэ пяці журналістаў — **фотакарэспандэнта інтэрнэт-газеты "Салідарнасць" Сяргея Балая, фотакарэспандэнта агенцтва "Інтэрфакс-Захад" Руслана Рындзевіча, відэааператара агенцтва БелаПАН Паўла Падабеда, відэааператара Алеся Баразенку і карэспандэнта "Нашай Нівы" Алеся Пілецкага.**

Падчас "зачысткі" ў аўтазакі закідвалі ўсё новых і новых людзей — каго с праспекта Незалежнасці, каго з вуліцы Леніна, каго з Нямігі...

За журналістамі потым у міліцыю прыехаў прэс-афіцэр, і іх вызвалілі. А на іншых затрыманых склалі пратаколы, абвінаваціўшы іх у дробным хуліганстве.

## Адны незнаёмыя твары

Паколькі на акцыю выйшла публіка, якая сябруе з інтэрнэтам, то сярэдні ўзрост яе ўдзельнікаў хутчэй за ўсё не перавышаў 30 гадоў. Я апытала 26 чалавек. 17 з іх былі студэнтамі навучальных устаноў, яшчэ восем нядаўна скончылі навучанне, яшчэ трое — настаўніца, інжынер і праграміст — ва ўзросце ад 32 да 35 гадоў.

Было цікава назіраць, як людзі калонай прайшлі ад ГУМа да плошчы Незалежнасці і там хутка разышліся — хто ў падземны пераход, хто на лавачку. Міліцыянты ў форме і ў цывільным пачалі хадзіць і ўглядвацца ў твары. Да плошчы пад'ехалі два аўтазакі і аўтобус. Але каго хапаць? Сярод удзельнікаў акцыі не было вядомых апазіцыянераў. Твары ж усе незнаёмыя. Усе маладыя, апранутыя прыкладна аднолькава. У выніку паздымалі ўсіх на відэа для парадку і з'ехалі ні з чым.

## Ад сумы і ад турмы...

Пазней я паразмаўляла з сябрамі і бацькамі затрыманых, якіх трымалі ў міліцыі Цэнтральнага раёна. Адразу кінулася ў вочы, што людзі сабраліся абсалютна незнаёмыя. Запытвалі адзін у аднаго, ці не даслаў хто адтуль смску, шэптам высвятлялі, што можа быць за акцыю. Маці аднаго студэнта радасна крыкнула: *"Наш знайшоўся!"* Паказвае мабільны: *"Вось, піша, што ў Ленінскім. Ну, шчаслiва вам, мы туды зараз з мужам паедзем. Вы не ведаеце, дзе гэта? У нас гэта першы раз".* Амаль усе трапілі ў міліцыю ўпершыню. Амаль усе студэнты. Кожны просіць не называць яго прозвішча. Адзін сказаў, што можа назвацца і патлумачыў: *"Я быў на першай акцыі, цяпер другі раз, і мне ўсё спадабалася. Дзеянні супрацоўнікаў міліцыі — гэта без каментарыяў. Я цяпер магу сказаць, што мяне завуць Павел Бартулёў. Мне 22 гады. Сёння я абараніў дыплом, і мне ўжо нічога не пагражае. Вось адзначыў абарону такім чынам".*

## Што далей?

На наступны дзень тых удзельнікаў акцыі, якіх не адпусцілі дамоў, каралі штрафамі ад дзвюх да 30 базавых велічынь. Бюджэт гэта істотна не папоўніла, на намер удзельнічаць у наступных акцыях хутчэй за ўсё таксама не паўплывала...

Невядома, якія захады будуць прынятыя 29 чэрвеня, бо акцыі плануецца ладзіць кожную сераду. А наведвальнікі сацыяльных сетак пакуль абмяркоўваюць апошнюю акцыю...

**Любоў ЛУНЁВА.**

## *«Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі» адбылася не толькі ў сталіцы*

**У Віцебску** міліцыянеры ачапілі плошчу Перамогі і скразныя праходы да яе, а сябры БРСМ тым часам пайшлі раздаваць прахожым паперкі з надпісам: "1941, 22 чэрвеня, помнім".

**У Гродне** таксама задзейнічалі сяброў БРСМ, якія стаялі на плошчы з дзяржаўнымі сцягамі. Карціну дапаўняў камерны аркестр на сцэне, а на прылеглых вуліцах міліцэйскія машыны.

**У Гомелі** гараджан на плошчу таксама не пусцілі. Улады не сталі задзейнічаць сяброў БРСМ, а разгарнулі вучэнні выратавальнікаў. Пры гэтым людзі не дазволілі ім мыць свой аўтакран, заявіўшы, што не дапусцяць псавання экалогіі.

**У Брэсце** з паўтысячы чалавек сабраліся каля ЦУМа. Стаялі моўчкі. Калі спецназ пайшоў на людзей, пачалі пляскаць у далоні. У міліцыю патрапілі 18 чалавек.

**У Магілёве** абышлося без затрыманняў. У цэнтры горада сабраліся каля 300 чалавек. Кіроўцы сігналілі пад іх апладысменты.

Акцыі прайшлі ў некалькіх гарадах — раённых цэнтрах. **У Салігорску, Вілейцы, Маладзечне і Бярозаўцы** міліцыянеры прэвентыўна затрымалі вядомых грамадскіх актывістаў. **У Ваўкавыску** 43 чалавекі з 67 удзельнікаў акцыі трапілі ў міліцыю. Праверылі дакументы і ўсіх адпусцілі.

**У Лідзе** міліцыянеры разбілі галаву журналісту, які супрацоўнічае з "Белсатам", Сяргею Карпенку. Журналіст быў разам з жонкай недалёка ад месца правядзення акцыі. У шпіталі Карпенку на галаве наклалі тры швы.

БЛІЦ

*Народныя гулянні — новая форма пратэсту ў Беларусі. Штотыднёва ў сераду на цэнтральныя плошчы некаторых гарадоў выходзяць людзі. Без сцягоў, без лозунгаў, без транспарантаў. Людзі проста гуляюць, патрабуючы гэтым палітычных і эканамічных перамен у краіне. Гэта выклікае даволі нервовую рэакцыю з боку сілавых структур...*

*"Народная Воля" вырашыла пацікавіцца ў сваіх рэспандэнтаў:*

# *Ці ёсць, на ваш погляд, сэнс у маўклівых акцыях пратэсту? І ці збіраецеся вы ў іх удзельнічаць?*

**Юрась ГУБАРЭВІЧ, намеснік старшыні руху "За свабоду":**

— Безумоўна, сэнс у правядзенні падобных акцый ёсць. Знойдзены новы і даволі прымальны фармат іх правядзення Гэтыя акцыі не затухаюць. Яны выяўляюць пратэстныя настроі ў грамадстве. У "маўклівых гуляннях" ёсць відавочны плюс — да іх далучаюцца людзі, якія асцерагаліся прымаць удзел у акцыях, якія праводзіла апазіцыя. На маю думку, 1000—2000 пратэстуючых для Мінска — гэта не так шмат, а вось тое, што да гэтых акцый далучаюцца людзі ў маленькіх і вялікіх рэгіянальных гарадах — гэта паказальна.

Што да ўдзелу прадстаўнікоў руху "За свабоду", то нашы актывісты рэгулярна прымаюць удзел у падобных акцыях.

**Генадзь ФЯДЫНІЧ, старшыня Незалежнага прафсаюза радыёэлектроннай прамысловасці:**

— Калі ўлада хвалюецца, то, безумоўна, правядзенне падобных акцый мае сэнс. Прычым на гэтых акцыях ёсць месца не толькі моладзі, але і людзям усіх пакаленняў. На маю думку, прадстаўнікам улады было б няблага самім прыняць удзел у іх — проста прыйсці да людзей, пагутарыць... Што да асабістага ўдзелу ў "маўклівых акцыях", то адкажу так: і мяне, і актывістаў нашага прафсаюза не трэба агітаваць да ўдзелу ў іх. Мы ведаем пра гэтыя акцыі, і кожны сам вырашае, як, дзе і ў чым яму ўдзельнічаць...

**Уладзімір КОЛАС, старшыня Рады беларускай інтэлігенцыі:**

— Рада беларускай інтэлігенцыі яшчэ гадоў дзесяць таму, у тым ліку і праз "Народную Волю", прапаноўвала менавіта такі фармат правядзення акцый. Акцыі негвалтоўнага супраціву — гэта якраз тое, што патрэбна Беларусі. Сэнс у іх, безумоўна, ёсць: людзі бачаць, што іх шмат... Што да асабістага ўдзелу, то я з задавальненнем прыму ўдзел у наступнай акцыі, калі буду ў краіне.

**Юрый ЗАХАРАЎ, выконваючы абавязкі намесніка старшыні Незалежнага прафсаюза гарнякоў (Салігорск):**

— Сябры нашага прафсаюза не прымалі і не збіраюцца прымаць удзел у падобных акцыях. Усе пытанні, якія ў нас узнікаюць, мы вырашаем напрамую з кіраўніцтвам "Беларуськалія".

На маю думку, любая акцыя павінна мець хоць нейкія патрабаванні. А так проста выходзіць і моўчкі стаяць на плошчы не мае сэнсу. Гэта маё асабістае меркаванне.

**Мікалай БЕЛАНОЎСКІ, старшыня Мінскага гарадскога аб'яднання прафсаюзаў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:**

— Хто гэтыя акцыі арганізоўвае? Гэта безадказнае стаўленне да людзей — заклікаць праз сацыяльныя сеткі кагосьці некуды выходзіць. Заклікалі, а самі ў кусты? Людзей проста падстаўляюць. Я вам так адкажу: калі мы нешта арганізоўваем, то робім гэта адкрыта, бо не баімся за гэта адказваць...

**Аляксандр МАРХВІДА, інжынер:**

— Я браў удзел у гэтых акцыях. Сэнс ёсць. Маўклівыя пратэсты патрэбны і дапамагаюць іншым убачыць, што ёсць тыя, хто не баіцца, гатовы дзейнічаць і нешта рабіць. "Маўклівасць" дапамагае паказаць, як рэжым баіцца свайго народа. Калі збіраецца вялікая колькасць людзей, нічога не патрабуе, а іх ўсё роўна затрымліваюць і судзяць, астатнія абураюцца і жадаюць выйсці на наступную акцыю.

**Апытанне праводзіў Віталь ГАРБУЗАЎ.**

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА

*Борис ЖЕЛИБА,*
*доктор экономических наук,*
*профессор*



# Падение при... росте

Какой-то парадокс!

Валовой внутренний продукт растет рекордными темпами (12,5%), экспорт растет также рекордными темпами, а реальные зарплаты падают вдвое, валютные курсы белорусского рубля подскочили почти втрое, цены становятся заоблачными (инфляция с начала года — 25,4%), а на полках магазинов многие товары исчезают.

В центре всего, конечно, валютный кризис. Хотя власти его отрицают, как и то, что мировой финансовый кризис отрицательно сказался и на нас. Как в той тарабарщине: этого не может быть, потому что не может быть никогда. А на практике? Чем больше экономика Беларуси производит, чем больше экспортирует, тем еще больше импортирует. Тем больше отрицательное сальдо торгового баланса (по товарам — рекордные минус 3,57 млрд долларов за четыре месяца). Чем оно больше, тем больше дефицит валюты. Чем больше дефицит валюты, тем слабее обменный курс белорусского рубля, меньше наша зарплата, выше цены. И, как мне кажется, никто толком не знает, как выйти их этого порочного, заколдованного круга.

Чтобы уйти от дефицита любого товара, какой бы дефицит на него ни ощущался, надо сделать цену равновесной. Чтобы спрос на продукцию уравновешивал ее предложение, чтобы товар не пылился на полках и не залеживался на складах, но и не сметался с полок со свистом, едва там появившись. Так и с валютой — она тоже товар. Хочешь, чтобы нормально была в продаже — установи равновесную цену, т.е. равновесный обменный курс. Он и будет рыночный. Для этого надо как можно быстрее уйти от администрирования при установке валютных курсов белорусского рубля. Но что мы видим? С 24 мая, согласно совместному постановлению правительства и Нацбанка, курс продажи инвалюты на всех сегментах валютного рынка не может отличаться от официального более чем на 2%. Это курс доллара в районе 5000 рублей. Накопленные в результате пустой эмиссии белорусские рубли мечутся из угла в угол, не могут найти применения. По такому курсу нормально валюту не купишь. Где рублям найти выход? На потребительском рынке цены фантастические, либо отдельных товаров вообще нет. Рублевые депозитные проценты, как бы их ни повышали, уже не перекрывают инфляцию. Поэтому и накапливаются рубли в виде отложенного спроса на валюту на руках у населения и на счетах предприятий.

Власти опасаются, что если отпустить белорусский рубль в "свободное плаванье", то его равновесные валютные курсы с учетом растущего рублевого навеса, который хлынет на валютный рынок, тоже улетят в облака, как цены на наиболее дефицитные товары в магазинах. Напомним, что наличный доллар на "черном рынке" торгуется по 6300—6500 рублей. Цены доллара на межбанковском рынке, который еще недавно как-то учитывал спрос и предложение, колебались в промежутке 7000—8500 безналичных "зайцев". Естественно, накопленный отложенный спрос на валюту сделает эти курсы номинально еще больше. Кто может сказать, какой курс доллара надо выставить в обменниках, если учесть, что Нацбанк и впредь не будет продавать коммерческим банкам валюту на их подкрепление, чтобы не было очередей? 7, 8, 10 тысяч? Лично я и при 10.000 отсутствие очередей не гарантирую. Поэтому Нацбанк и правительство с такой точки зрения можно понять. Но чем больше накапливается отложенный спрос на валюту, тем призрачней становятся перспективы вернуться к тому, "што раньш было"! Именно политика затягивания принятия правительством и Нацбанком неотложных решений по девальвации рубля и привела к остроте нынешнего валютного кризиса. Мол, раз обещали, что девальвации не будет, то держимся до конца. И додержались.

Эксперты МВФ считают, что медлить с переходом на единый (читай — рыночный) курс национальной валюты никак нельзя. А власти, опасаясь завышенного нового курса, считают, что это навредит бизнесу. А эксперты МВФ, и не только они, считают, что в настоящих валютных условиях предприятий экономика не может нормально функционировать. Экспортеры будут всяческими путями придерживать валютную выручку, уходя от продажи ее за бесценок, импортеры станут и дальше любыми способами изыскивать валюту, чтобы как-то выживать. Но власти обещали, что будут "держаться" курс рубля, по меньшей мере, до конца года. Пока они снова "держатся", парадоксы белорусской экономики будут автоматически воспроизводиться.

Тем временем кризис углубляется. Объем золотовалютных резервов Беларуси по стандартам МВФ составил 3,59 млрд в долларовом эквиваленте и уменьшился с начала года на 28,6%. Из них монетарное золото (золото в слитках) в долларовых ценах составило 1,55 млрд, а чистые иностранные активы в мировых валютах — всего 2,51 млрд долларов. Всего ничего. Валовой внешний долг страны за первый квартал 2011 года увеличился на 3,22 млрд долларов и достиг 31,7 миллиарда. По данным Нацбанка, на обслуживание внешнего долга в первом квартале было направлено 1,27 млрд долларов, или 9,6% ВВП. Внешний долг в расчете на душу населения достиг 3347 долларов США.

*(Окончание на 2-й стр.)*

ОФИЦИАЛЬНО

## *Прокопович в Нацбанк больше не вернется*

*«Я хочу, чтобы он жил», — заявил вчера А.Лукашенко.*

По словам Лукашенко, Петр Прокопович будет задействован на других направлениях.

"Петр Петрович больше в Нацбанк не вернется. Я хочу, чтобы он жил, — сказал Лукашенко журналистам. — Прокопович — человек, преданнейший своей стране, честный и порядочный. И он ошибался, и правительство, и я должен был это видеть. Не посыпайте голову пеплом, это преданнейший Отечеству человек.

**Продолжение темы про Прокоповича — на 2-й странице.**

ПАД ГРАДУСАМ

## *На выхадныя — дождж*

Паводле прагнозу Рэспубліканскага гідраметэацэнтра, у найбліжэйшыя дні ў Беларусі чакаюцца дажджы.

**25—26 чэрвеня** па краіне воблачна з праясненнямі. У суботу, 25 чэрвеня, на большай частцы тэрыторыі кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах навальніцы. Вецер паўночна-заходні 4—9 м/с, пры навальніцах парывы да 14 м/с. Тэмпература паветра ноччу +8—15°С, днём +16—22°С.

**26 чэрвеня** ноччу на большай частцы тэрыторыі краіны днём месцамі кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах навальніцы. Вецер паўночна-заходні 5—10 м/с, пры навальніцах парывы да 14 м/с. Тэмпература паветра ноччу +6—13°С, днём +16—22°С.

ПЕРСОНА

# Сергей Сидорский воспитывает внучку

*На днях внучке экс-премьер-министра Беларуси Анастасии исполнился год.*



После отставки бывший премьер-министр **Сергей Сидорский** ведет непубличный образ жизни. Сергей Сергеевич не делает ни громких, ни тихих заявлений по поводу нынешней экономической ситуации, не посещает вместе с супругой светские тусовки, не раздает поучительные интервью.

Возможно, отсутствие Сидорского в поле зрения и спровоцировало волну самых чудовищных слухов о нем.

Так, буквально на днях в редакцию сорока на хвосте принесла "новость" о том, что экс-премьер серьезно болен — якобы случился инсульт с серьезными последствиями. А его супругу Людмилу будто бы регулярно приглашают на допросы к следователю — в рамках уголовного дела известного модельера **Саши Варламова**, которого не так давно обвинили в превышении служебных полномочий и хищениях. Как известно, **Людмила Сидорская** общалась с Варламовым, не раз была замечена на фестивале "Мельница моды", который организовывал Варламов...

"Народная Воля" рассказала об этих "коридорных разговорах" **Оксане Сидорской,** дочери премьер-министра.

— Тем людям, кто распространяет такие слухи, нужно устроиться на работу, — сказала она. — Потому что тем, кто занят делом, — не до слухов и не до сплетен.

**— Значит, со здоровьем у отца все в порядке?**

— Слава Богу, да.

**— А чем он сейчас занимается? На работу не устроился?**

— Пока находится в отпуске, занимается внучкой. Ей на днях годик...

**— Поздравляю, пусть растет здоровенькая и красивенькая. А Людмила Владимировна на допросы по делу Варламова ходила?**

— Нет. Они с Варламовым хорошо знакомы, общались, мама входила в попечительский совет "Мельницы моды" (*кстати, в попечительский совет "Мельницы моды" входила также и экс-замглавы Администрации президента* ***Наталья Петкевич,*** *которая также пока не трудоустроена.* — ***М.К.***), могла помочь ему советом. Но каких-то тесных связей в плане работы, организации фестиваля у них не было — я это точно знаю.

**Марина КОКТЫШ.**



## *Людмила СИДОРСКАЯ: «Варламов помогал мне создать образ»*

"Саша Варламов шил мне официальные костюмы — для посещения общественных учреждений, в том числе и с благотворительными целями, мне надо иметь определенный образ, и Саша помогал мне в его создании".

**(Из интервью "Женскому журналу".)**

Народная Воля http://www.nv-online.info 24—27 ЧЭРВЕНЯ 2011 г.

СІТУАЦЫЯ

*Уладзімір КІШКУРНА:*

# «Уклаўшы шалёныя грошы ва ўласны бізнес, я застаюся на вуліцы...»



Мы толькі і чуем, што ўмовы вядзення бізнесу ў краіне значна спрошчаны, што прадпрымальнасць заахвочваецца і вітаецца, што дзяржава больш не душыць прыватную ініцыятыву, асабліва калі чалавек робіць нешта сваімі рукамі. Пра тое, якую вагу маюць гэтыя лозунгі, Уладзімір Кішкурна адчуў, як кажуць, на ўласнай скуры.

У 2009 годзе Уладзімір Герасімавіч Кішкурна набыў ва ўласнасць цырульню. *"Тады я падсабраў грошай, вырашыў паспрабаваць заняцца бізнесам,* — гаворыць ён. — *Па аб'яве знайшоў прапанову аб продажы цырульні. Умовы мяне цалкам задаволілі: памяшканне знаходзіцца, лічы, у цэнтры Мінска, на Бяды, 4, — у будынку інтэрната Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі. Я заключыў дамову арэнды памяшкання з універсітэтам. Так і стаў уладальнікам цырульні "Эўрыдыка стыль". Згодна з дагаворам арэнды, цырульня ў памяшканні інтэрната павінна была працаваць да 2012 года..."*

Першае, што зрабіў на новым месцы Уладзімір Кішкурна, дык гэта якасны рамонт: *"Я ўсё самастойна спраектаваў, адрамантаваў сцены, столь, падвёў да кожнага працоўнага месца ваду (раней яна там была толькі ў адным месцы), прывёз новае абсталяванне... Адкрыў у цырульні касметалагічны кабінет. І пачалі працаваць, папярэдне ўзгадніўшы гэта з санэпідэмстанцыяй, якая мае пэўныя патрабаванні для падобных устаноў. Усё ўсіх задавальняла..."*

Уладзімір Кішкурна прызнаецца, што на набыццё цырульні і рамонт ён патраціў ні многа ні мала, а 25 тысяч долараў, Але, падбіўшы "дэбет з крэдытам", зразумеў, што за тры гады, на якія была разлічана дамова аб арэндзе памяшкання, ён зможа выйсці хаця б "у нуль". І ўсё ішло больш-менш паспяхова да сакавіка бягучага года.

— Цырульня працавала, я спраўна аплачваў арэндную плату, прыкладна 190 еўра ў месяц, плаціў за камунальныя паслугі, апошнім часам па 400—500 тысяч рублёў, — расказвае прадпрымальнік. — У нас працуе адносна невялікі штат — разам са мной 11 чалавек. Я сумленна плачу ўсе падаткі за гэтых людзей, раблю ўсе неабходныя адлічэнні ў фонд сацыяльнай абароны, плачу людзям зарплату... За два гады, што мы паспелі адпрацаваць у цырульні, з'явілася пастаянная кліентура. Не хачу хваліцца, але ў мяне працуюць сапраўдныя прафесіяналы... І тут здарыўся форс-мажор...

Прычым форс-мажор у прамым сэнсе гэтага слова. Справа ў тым, што ў дамове, якую Кішкурна падпісаў з Беларускім дзяржаўным універсітэтам інфарматыкі і радыёэлектронікі, было напісана, што яна можа быць скасавана ў аднабаковым парадку ў выпадку форс-мажорных абставін.

У лісце ад 10 сакавіка бягучага года за подпісам прарэктара па эканоміцы і будаўніцтве БДУІР Уладзіміра Мілько ўсяго адзін сказ: *"У сувязі з правядзеннем ў інтэрнаце №2 (вул. Бяды, 4) капітальнага рамонту БДУІР паведамляе, што дамова арэнды №2009/17 ад 01.09.2009 г. будзе скасавана з 1 ліпеня 2011 года".*

Для Уладзіміра Кішкурны гэта быў шок.

— Я і так здагадваўся, што займацца хоць нейкім бізнесам у нашай дзяржаве небяспечна, а вось пасля гэтага ліста канчаткова ўпэўніўся, што дзяржаўныя ўстановы — мякка кажучы, ненадзейныя партнёры ў гэтай справе. У нас жа што з высокіх трыбун гавораць? Дзяржава аказвае падтрымку малому і сярэдняму бізнесу. Я, па шчырасці, не прасіў, каб мне дапамагалі, хацеў толькі, каб не перашкаджалі. А атрымалася што? Я на законных падставах арандаваў памяшканне, разлічваў працаваць там да заканчэння тэрміну дамовы, разлічваў расходы, зрабіў рамонт, толькі на пачатку патраціў 25 тысяч долараў. І на табе! Уклаўшы шалёныя грошы ва ўласны бізнес, я застаюся на вуліцы...

Звяртацца ў суд Уладзіміру Кішкурна не мае сэнсу — БДУІР не парушаў закон, а скасаваў дамову згодна з адным з яе пунктаў. А ў суд, як вядома, чалавечую крыўду не панясеш, там кіруюцца паперамі... І нікому, здаецца, няма справы да таго, што чалавек ствараў бізнес, укладваў у яго грошы, душу, час, здароўе...

За некалькі дзён да форс-мажорнага высялення Уладзімір Кішкурна прыйшоў на прыём да прарэктара БДУІР Уладзіміра Мілько. Прадпрымальнік спрабаваў дамовіцца аб працягу дамовы арэнды.

"Гэтае пытанне ў кампетэнцыі дырэктара студэнцкага гарадка Луцкага, — сказаў прарэктар. — Маё прозвішча тут стаіць толькі таму, што я падпісваю дамовы аб заключэнні ці скасаванні дамоў. Але робіцца гэта па прапанове іншых людзей — прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай працы Герасімава і дырэктара студгарадка Луцкага. Калі вы з ім адпрацуеце пытанне, то мы працягнем гэтую дамову. Але вы позна апамяталіся..."

Тут жа Уладзімір Мілько набраў па тэлефоне дырэктара студгарадка БДУІР спадара Луцкага. Той быў катэгарычны: "Пытанне ўжо вырашана. Мы ўжо вызначыліся. У памяшканні, дзе зараз знаходзіцца "Эўрыдыка стыль", падчас рамонту размесціцца кастэлянка..."

Пасля гэтага прарэктар па эканоміцы і будаўніцтве параіў Уладзіміру Кішкурна: "Да прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай працы Герасімава вы можаце ўжо не ісці — ён вам адкажа тое ж самае. Самі разумееце, калі робяць рамонт, кватарантаў не трымаюць..."

На іншы вынік размовы Кішкурна і не разлічваў, хаця, зразумела, ён не збіраўся ўкладваць свае грошы ў рамонт апартаментаў для кастэлянкі.

— Што будзеце рабіць далей? — пытаюся ва Уладзіміра Герасімавіча.

— А што тут зробіш? Трэба працаваць далей...

Але за два гады, што працавала цырульня, правілы для людзей, якія хочуць займацца гэтым відам бізнесу, змяніліся. І не на карысць прадпрымальніка. *"Два гады таму, каб распачаць працу, мне толькі і патрэбна было, што паставіць у вядомасць санэпідэмстанцыю, бо праект цырульні я рабіў сам...* — гаворыць Уладзімір Кішкурна. — *Зараз жа не ўсё так проста... Па шчырасці, я знайшоў новае памяшканне для цырульні — тут недалёка, на Багдановіча. Разумееце, цырульны і касметалагічны бізнес не церпіць прастою: калі я не буду працаваць два-тры месяцы, то ўсе мае напрацаваныя гадамі кліенты разбягуцца ў іншыя салоны... Навошта ім мяне чакаць? Дык вось: арэнда новага памяшкання, значна больш прасторнага, чым мінулае, каштуе прыкладна 800 еўра ў месяц. Але заключэння адной гэтай дамовы мала. Каб распрацаваць праект новага салона, я, згодна з дзеючым заканадаўствам, абавязкова павінен звярнуцца ў аддзел планіроўкі і забудовы Мінгарвыканкама. Тут мне павінны даць дазвол на распрацоўку праекта. Затым я ў абавязковым парадку павінен пайсці да праекціроўшчыкаў, каб яны праект распрацавалі. Пасля гэты праект павінен прайсці ўзгадненне ў іншых інстанцыях. Усё гэта каштуе часу і грошай... І калі нейкаму чыноўніку праект не спадабаецца і яго "зарубяць", то ўсё трэба будзе пачынаць спачатку. Карацей, ад распрацоўкі да зацвярджэння праекта пройдзе мінімум тры-чатыры месяцы. Увесь гэты час я павінен буду плаціць па 800 еўра за пустое памяшканне арэндадаўцу, каб яго не аддалі ў арэнду камусьці іншаму. Вось вам і спрасцілі ўмовы для вядзення бізнесу. Вось вам і Год прадпрымальнасці, абвешчаны ў краіне. І так паўсюль: за што ні возьмешся — усё толькі для таго народа, што па кабінетах сядзіць".*

Каментарыі, як кажуць, не патрабуюцца.

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**

## *Леаніду Козіку спадабалася антыкрызісная праграма АГП*

*Гэта зразумела з ліста за подпісам старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, які днямі прыйшоў на офіс АГП.*

*"Дзякуем Вам за прадстаўленую магчымасць азнаёміцца з Антыкрызіснай праграмай для Беларусі, якая носіць, на нашу думку, шматпланавы характар прапанаваных мер і акрэслівае магчымыя інструменты і шляхі выхаду з наяўнай эканамічнай сітуацыі ў рэспубліцы,* — гаворыцца ў лісце. — *Лічым, што многія палажэнні праграмы ў будучыні знойдуць сваё адлюстраванне ў пытаннях збалансаванага развіцця эканомікі краіны".*

Намеснік старшыні АГП **Леў Марголін** лічыць такі адказ пазітыўным момантам.

*"Федэрацыя прафсаюзаў, у адрозненне ад урада і Адміністрацыі прэзідэнта, даволі аператыўна адрэагавала на Антыкрызісную праграму, і, мяркуючы па ўсім, там яе нават прачыталі,* — адзначыў Леў Марголін у інтэрв'ю ucpb.org. — *З асноўнымі палажэннямі, выкладзенымі ў праграме, сапраўды вельмі складана спрачацца, таму яны і не спрачаюцца. Іншая справа — ім прасцей, таму што не ім выконваць гэтую праграму і пераконваць Лукашэнку ў тым, што трэба зрабіць так, а не інакш. Таму яны, нічога не страчваючы, могуць даваць цалкам высокую ацэнку Антыкрызіснай праграме. Але гэта ўжо сам па сабе факт. Раней такога не было*".

## *Што скуплялі беларусы?*

З імклівым ростам коштаў, знікненнем валюты і змрочнымі прагнозамі на будучыню беларусы, як вядлома, змагаліся праверанымі спосабам: набывалі ўсё, што магчыма, пра запас. Белстат падлічыў, што ў першую чаргу назапашвалі грамадзяне ў апошнія пяць месяцаў (з пачатку 2011 года).

І вось што атрымалася.

З харчовай групы тавараў беларусы найбольш актыўна набывалі алей (на 29,9% больш, чым за аналагічны перыяд 2010 года).

Продаж макаронных вырабаў узрос на 29,5%, сокаў — на 27,3%, мяса — на 17,9%.

Але несумненным лідарам продажу стаў... алкаголь.

Каньяку і брэндзі рэалізавана 146,6 тысячы дал (на 45,3% больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года), лікёра-гарэлачных вырабаў — 862,6 тысячы дал (на 43,6% больш), вінаградных він — 1 мільён 330,4 тысячы дал (больш на 27,2%).

З нехарчовых тавараў асаблівы попыт быў на будаўнічыя матэрыялы: прададзена на 65% больш за аналагічны перыяд мінулага года, сінтэтычныя мыйныя сродкі — на 50,1% больш, абутак — на 46,6% больш, трыкатажныя вырабы — больш на 35,3%.

ЗАКУЛІССЕ

# «Тэхнічная» адстаўка Пятра Пракаповіча

*Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб прызначэнні **Юрыя Алымава** выконваючым абавязкі старшыні праўлення Нацыянальнага банка. Да гэтага ён працаваў першым намеснікам галоўнага банкіра краіны.*



У той жа час кіраўнік Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч не звольнены. Як паведамляе прэзідэнцкая прэс-служба, ён *"нядаўна перанёс сур'ёзную аперацыю на сэрцы"* і *"павінен на працягу бліжэйшых месяцаў прайсці курс медыцынскай рэабілітацыі".*

Цікава, што ўказ быў падпісаны літаральна праз пару дзён пасля таго, як Аляксандр Лукашэнка спрабаваў пераканаць усіх, што Пракаповіча няма кім замяніць.

*"Назавіце мне прозвішчы, хто будзе заўтра старшынёй Нацбанка і прэм'ер-міністрам. Называйце, і я вам скажу: так ці не. Лічыце, што гэта рытарычнае пытанне. Не думайце, што ў нас выгараджаны плот з прэм'ер-міністраў і старшынь Нацыянальнага банка. Людзей, якія не проста па буквары могуць кіраваць Нацыянальным банкам і ведаюць планавую і рынкавую эканоміку, людзей, якія па калена закапаныя ў зямлю, якія ведаюць, што такое праца і адкуль бяруцца грошы, дасведчаных людзей, — адзінкі",* — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

І ўсё ж у адрозненне ад Пятра Пракаповіча Юрый Алымаў — якраз прафесіянальны банкір.

Юрый Алымаў нарадзіўся ў Кіргізіі ў 1957 годзе. Скончыў Ленінградскі фінансава-эканамічны інстытут ім. М.А.Вазнясенскага, Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, магістратуру Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. У 1985—1986 гг. быў старшым эканамістам Светлагорскага гарадскога фінансавага аддзела, у 1986—1989 гг. — загадчыкам ашчаднай касы Светлагорскага раёна, у 1989—1993 гг. — намеснікам старшыні Светлагорскага гарвыканкама, у 1993—1997 гг. — намеснікам начальніка Гомельскага абласнога ўпраўлення ААБ "Беларусбанк", у 1997—1998 гг. — намеснікам старшыні праўлення ААБ "Беларусбанк", у 1998—2001 гг. — намеснікам старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі, з верасня 2001 г. — першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка.

Што ж тычыцца Пятра Пятровіча Пракаповіча, то ён зрабіў проста неверагодную кар'еру — з сельскіх будаўнікоў у галоўныя банкіры краіны. Спрабуючы разабрацца ў тым, як, не маючы адпаведнай фінансавай адукацыі і вопыту, Пятру Пятровічу ўдалося стаць чыноўнікам-доўгажыхаром і аказацца ў вялікай пашане ў кіраўніка дзяржавы (атрымаць нават зорку Героя Беларусі), журналісты даўно склалі так званы "дзесяць цікавых фактаў" з біяграфіі Пракаповіча.

1. Пётр Пятровіч Пракаповіч нарадзіўся ў 1942 годзе на акупаванай немцамі тэрыторыі: у вёсцы Роўна Пружанскага раёна. Такім чынам, па ўзросце ён з'яўляецца адным са старэйшых кіраўнікоў вышэйшага ўзроўню.

2. У школе вёскі Камароўка Брэсцкага раёна Пётр Пракаповіч сядзеў за адной партай з першым беларускім касманаўтам Пятром Клімуком. У класе атрымаў мянушку Прафесар, але ў той жа час заставаўся ў цені, амбіцый і жадання пакрасавацца не меў. Не курыў, але калі аднойчы аднакласнікі выпадкова знайшлі банку самагонкі, нароўні з іншымі ўдзельнічаў у яе спусташэнні.

3. Па заканчэнні сярэдняй школы Пётр Пракаповіч разам з аднакласнікам паехаў у Луганскую вобласць паступаць у горнапрамысловую школу. Сябар паступіў і стаў шахцёрам, а Пракаповіча з-за стану здароўя не прынялі. Ён вырашыў стаць будаўніком. Праз некалькі гадоў скончыў Днепрапятроўскі інжынерна-будаўнічы інстытут, каля дзесяцігоддзя працаваў ва Украіне і Казахстане, затым вярнуўся ў Беларусь.

4. У бытнасць дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларусі (1990—1995 гг.) Пётр Пракаповіч жорстка, з нагоды і без нагоды, крытыкаваў старшыню праўлення Нацбанка Станіслава Багданкевіча. Магчыма, гэта і абумовіла яго будучую кар'еру. Пасля перамогі на прэзідэнцкіх выбарах дэпутата Аляксандра Лукашэнкі той неўзабаве прызначыў Пракаповіча намеснікам кіраўніка сваёй Адміністрацыі, а ў сакавіку 1998-га — кіраўніком Нацбанка.

5. Пётр Пракаповіч — "Герой Беларусі". Гэтага звання ён быў удастоены ў 2006 годзе за значны ўклад "у забеспячэнне ўстойлівых тэмпаў эканамічнага росту і павышэнне на гэтай аснове ўзроўню жыцця насельніцтва рэспублікі". На дадзены момант званне Героя Беларусі носяць усяго дзесяць чалавек. Ніводнага чыноўніка ўзроўню Пракаповіча ў гэтым спісе няма.

6. Пётр Пракаповіч, працуючы галоўным банкірам краіны, актыўна дапамагаў землякам. У 2006-м, мабыць, па яго ініцыятыве, у Пінску быў адкрыты Палескі дзяржаўны ўніверсітэт з двума факультэтамі: эканамічным і банкаўскай справы. Сёння Пётр Пракаповіч з'яўляецца адзіным Ганаровым доктарам ПалесДУ.

Праз год у сціплых Пружанах з насельніцтвам каля 25 тысяч чалавек быў адкрыты Лядовы палац — ён абышоўся Нацбанку і аблвыканкаму ў 21 мільярд рублёў.

7. Пётр Пракаповіч двойчы правёў шокавую для насельніцтва аднаразовую дэвальвацыю беларускага рубля. Першы ўдар для беларусаў быў нечаканым: у снежні 2008 года першы намеснік Пракаповіча Павел Калаур заявіў газеце "Беларусы і рынак": пытанне аб 20%-най дэвальвацыі рубля нават не разглядаецца. Але ўжо 1 студзеня 2009 года стала вядома, што беларуская валюта абвалілася на тыя самыя 20%... У гэтым годзе ўжо сам Пракаповіч запэўніваў, што, пакуль ён узначальвае Нацбанк, ніякай разавай дэвальвацыі не будзе. А рубель абваліўся ажно на 56%.

8. Сярод чыноўнікаў Пётр Пракаповіч, напэўна, другі пасля Аляксандра Лукашэнкі па працягласці тэрміну знаходжання на сваёй пасадзе. За час яго працы ва ўрадзе змянілася ўжо пяць прэм'ераў.

9. Пётр Пракаповіч двойчы фатаграфаваўся з Лукашэнкам, седзячы на залатым запасе краіны. Першы здымак галоўнага банкіра і кіраўніка дзяржавы быў зроблены ў Цэнтральным сховішчы Нацыянальнага банка ў сакавіку 2006 года. Праз пяць гадоў, таксама напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, Пракаповіч, прадэманстраваўшы Лукашэнку старую фатаграфію, зноў запрасіў яго пасядзець на акуратна складзеных залатых злітках. Сцэну прадэманстравалі на дзяржаўных тэлеканалах.

— Ну, я памятаю, тут зусім няшмат было — унізе, — сказаў Аляксандр Лукашэнка, маючы на ўвазе свой візіт пяцігадовай даўнасці.

— Мы тады ўдваіх сядзелі на золаце. Цяпер можам утрох — каб Мікалай паміж намі сядзеў, — адказаў Пётр Пракаповіч. — Паглядзім, як мы будзем глядзецца на фоне таго, што стала ў 4,4 раза больш, чым было да гэтага часу.

Пасля здымак Лукашэнка заявіў: "Ну, малайчына, нездарма табе Героя Беларусі далі".

Радаваліся Пётр Пятровіч і Аляксандр Рыгоравіч ндоўга — зараз на такой колькасці залатых зліткаў ім ужо не пасядзець.

10. Ні за аднаго чыноўніка Аляксандр Лукашэнка не заступаўся так, як ён зараз заступаецца за Пракаповіча. І гэта пры тым, што "дзякуючы" палітыцы Нацыянальнага банка людзі згубілі ў заробках удвая. І ўсё ж... *"Тыя, хто заклікае да пошуку і пакарання вінаватых у сітуацыі, якая склалася, хочуць спарадзіць хаос улады... Такі падарунак я ім паднесці не магу",* — заявіў Лукашэнка. Але выконваючым абавязкі кіраўніка Нацыянальнага банка, падумаўшы, прызначыў Юрыя Алымава.

## *Астравецкая АЭС: дарага, але хутка?*

*Беларуская атамная электрастанцыя будзе будавацца па тэхналогіі ўзбуйненых блокаў, якая дазволіць скараціць тэрміны ўзвядзення станцыі. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў дырэктар дэпартамента па ядзернай энергетыцы Мінэнерга **Мікалай Груша** на ІІІ міжнароднай канферэнцыі "Атамная энергетыка ў ХХІ стагоддзі".*

Абраная тэхналогія трохі даражэйшая, бо патрабуе першапачатковых выдаткаў, але выйгрыш у часе, паводле разлікаў спецыялістаў, дазваляе кампенсаваць гэты недахоп.

Каб рэалізаваць абраную тэхналогію, праектны інстытут уносе ў беларускі праект пэўныя змены. *"Гэта пытанне яшчэ некалькіх гадоў, паколькі спачатку трэба правесці падрыхтоўчыя работы па катлаване. Да таго часу, калі будзе будавацца будынак рэактара, павінна быць створана база, якая дасць магчымасць ажыццяўляць такую тэхналогію*", — сказаў кіраўнік дэпартамента.

Стварэнне гэтай базы беларускія спецыялісты ўжо пачалі і плануюць завяршыць да 2014 года.

Першая атамная электрастанцыя ў Беларусі будзе будавацца паводле расійскага праекта АЭС-2006. Распрацоўка катлавана для будаўніцтва беларускай АЭС на Астравецкай пляцоўцы ў Гродзенскай вобласці пачнецца ў верасні 2011 года. Генеральны падрадчык будаўніцтва — расійскае ЗАТ "Атомстройэкспорт". Станцыя будзе складацца з двух энергаблокаў сумарнай магутнасцю да 2,4 тыс. МВт. Першы з іх плануецца запусціць у 2017-м, а другі — у 2018 годзе. Кошт беларускай АЭС з улікам інфраструктуры складзе 9 млрд долараў.

# Падение при... росте

*(Окончание. Начало на 1-й стр.)*

Цены на продовольственные товары, как сообщает Белстат, в мае 2011 года по сравнению с маем 2010-го увеличились на 36,9%. Только по сравнению с апрелем — уже на 13,1%. Если сравнивать цены с января по май текущего года с таким же периодом прошлого, то картофель подорожал на 78,4%, крупы — на 71,3%, растительное масло — на 53,7%, сахар — на 37,1% и т.д. Только за май цены выросли на белокочанную капусту в 1,5 раза, на чай и кофе — в 1,5 раза, яблоки подорожали в 1,8 раза, бананы и цитрусовые — в 1,5 раза. Как малообеспеченным семьям, да и не только им, ходить с детьми мимо лотков, на которых черешня еще несколько дней назад стоила свыше 40 тысяч рублей за килограмм?

Правительство все в большей степени переходит на ручное управление экономикой. Ограничивают вывоз продовольствия за границу. Но львиная его доля идет в Россию, куда ограничения не распространяются: она член Таможенного союза. Ограничивают рост цен за счет торговых надбавок и прямым администрированием. Нацбанк объявил о снижении финансирования госпрограмм и об очередном повышении ставки рефинансирования до 18%, отменено большинство льготных кредитов в жилищном строительстве. В дополнение президент вновь дает надежду на скорые миллиарды долларов, которые вольются в нашу экономику и счет которых уже идет на 10—12 миллиардов. Действительно, меньше никак нельзя. Только такая сумма, по оценкам экспертов, позволит остановить наше падение. Но кто ж нам их даст? МВФ? Европейский Союз все-таки принял решение об экономических санкциях в отношении трех белорусских компаний (для начала?). Остается продавать госсобственность. Но если продать вторую половину "Белтрансгаза" — это продать трубу, по которой качаются российские природные ресурсы, то продать "Беларуськалий" — это, по сути, продать свои недра и обобрать наших потомков.

Авторитарная модель белорусской экономики в очередной раз объявлена незыблемой. Значит, никаких серьезных реформ не предвидится. Хотя ее развал все более очевиден, и пропагандой делу не поможешь. Белорусская экономика скатывается к нелучшим образцам то ли советской экономики позднего горбачевского периода, то ли экономики 90-х годов минувшего столетия. На пороге растущие миллиардные валютные выплаты по долгам. Не будет ни прежних цен, ни пятисотдолларовых зарплат, как и свободной продажи валюты. Достаточно напомнить, что из заявленных на привлечение 6,4 млрд долларов прямых иностранных инвестиций с начала года поступило едва 700 миллионов. Несмотря на то, что в привычном стиле администрирования для выполнения этого задания предусмотрена персональная ответственность чиновников. Без всяких вариантов, только иностранные инвестиции могут глубоко модернизировать материально-техническую базу экономики Беларуси и позволят выровнять на этой основе торговый баланс. Но без реформы производственных, социально-экономических и политических отношений не будет и реформы технологической.

ПО ПОВОДУ...

# Гуляем на последние?

*Не так давно лидер движения "За свободу" Александр Милинкевич призвал отменить военный парад, запланированный в Минске на 3 июля: страна в кризисе, просит кредиты, а денег на помпезное мероприятие будет истрачено немало. Но дефиле военной техники и спортивное шествие все же состоятся. "Народная Воля" решила выяснить, что думают по этому поводу некоторые генералы.*

**Павел КОЗЛОВСКИЙ, генерал-полковник, первый министр обороны Республики Беларусь:**

— Я был участником самых больших парадов в Москве, в том числе и сотого парада на Красной площади, — вспоминает Козловский. — Конечно, в те годы подобные мероприятия проходили по-особенному, они демонстрировали мощь Советского Союза. Тогда уважение к офицерам, к Вооруженным силам было на высочайшем уровне! Я когда приезжал в свою родную деревню, вся деревня в гости приходила!

Когда Беларусь получила независимость и я стал министром обороны, мы ни одного парада не проводили. Было очень сложное время. Разделились советские Вооруженные силы, мы стали независимым государством, приняли решение создать свою национальную армию, были маленькие зарплаты и большие трудности с жильем. Некоторые горячие головы предлагали организовать парад, но тогда руководством республики было принято мудрое решение обойтись без этого.

На мой взгляд, сегодня мудрость власти была бы в том, чтобы не проводить помпезный парад. Можно было бы отметить праздник народным гулянием, организовать шествие спортсменов — тоже был бы праздник.

**Петр ГРИБАНОВ, генерал-лейтенант, служил в Белорусском военном округе, командовал Слонимской дивизией:**

— С одной стороны, мне кажется, что можно было и скромнее отметить День Независимости — это ж не юбилей какой-то. А с другой... Может, людям и нужно отдохнуть, расслабиться. Пусть даже тяжелое экономическое положение, но, возможно, люди отвлекутся...



**Валерий ФРОЛОВ, генерал-майор, экс-депутат Палаты представителей:**

— Понты нужны всегда. Тем более для армии. Армии в любых условиях нужно показывать, что она есть. Александр Милинкевич недавно призвал чиновников отменить парад. Но я в данном случае не разделяю его мнение. Я понимаю, что это сложно и дорого, но... Я — человек военный. Поэтому я за парад, даже если гуляют на последние гроши...

## ОФИЦИАЛЬНО

Праздничное шествие начнется в 12 часов, сообщает belta.by. Колонна пройдет от проспекта Машерова до проспекта Победителей.

На площадке около Национальной библиотеки Беларуси состоится концерт "Квітней, родная Беларусь!".

Вечером гуляния сместятся к стеле "Минск — город-герой". В районе проспекта Машерова пять часов, начиная с 21 часа, будет длиться гала-концерт республиканской общественно-культурной акции "Свет віншуе Беларусь!".

В 23 часа — салют.

**Марина КОКТЫШ.**

**У СОСЕДЕЙ**

*Римантас МИКАЙТИС:*

# «Мэр города ездит на работу на собственном автомобиле»

*“Арвидас Сабонис популярнее в городе, чем я”, — честно признался корреспонденту “Народной Воли” мэр Каунаса Римантас МИКАЙТИС, который принял у себя белорусских журналистов.*

...В Каунас можно влюбиться с первого взгляда. В нем всегда присутствовали дух свободы и патриотизма. Веселая молодежь на улице. Байкеры и велосипедисты. Кофе и пиво. Знаменитая на весь мир Лайсвес Аллея (Аллея Свободы). Впечатляющий средневековый центр.

А еще Каунас — баскетбольная Мекка Литвы. Поболеть за любимый всеми “Жальгирис” в бары приезжают даже пенсионеры на инвалидных колясках. В сентябре здесь пройдет чемпионат Европы — об этом знают, как мне показалось, даже дети.

— И, вы представьте себе, наш знаменитый баскетболист Арвидас Сабонис популярнее в городе, чем мэр, — с улыбкой признается градоначальник Каунаса **Римантас Микайтис**, принимая нас у себя в кабинете. — Это абсолютно нормально, потому что популярность баскетбола здесь просто зашкаливает. Кстати, сейчас Арвидас — посол нашего чемпионата, посещает страны-участницы предстоящего первенства. В этом году Каунас вообще может быть достойно представлен Европе и миру. Период очень интересный. Это все мобилизует, надо использовать возможности, чтобы город становился популярнее. Люди же затем приедут домой, будут делиться впечатлениями о Каунасе с друзьями. А хороший имидж еще никому не навредил.



**— В сентябре у вас пройдет европейское первенство по баскетболу, в Минске в 2014 году состоится чемпионат мира по хоккею. Каунас ожидает прибыли от спортивного мероприятия?**

— Прибыль в первую очередь получат местные гостиницы, рестораны, компании, которые работают в сервисном секторе. А для города это больше имидж. Но все то, что мы инвестируем в арену и инфраструктуру, — оно нам останется. Мы же впоследствии будем иметь самую большую арену в регионе! Учитывая хорошее расположение Каунаса, в будущем можем рассчитывать на зрителей из Латвии, Польши, Беларуси, которые, возможно, пожелают приехать сюда на концерты, спортивные состязания. Надеемся, что затраты затем окупятся.

**— И много было затрат?**

— 50 миллионов евро получили от государства, столько же — из Европы. Но больше всего затрат оплатил город.

**— Вы сказали, что ожидаете приезда в будущем в Каунас белорусских туристов, которых сейчас, по большому счету, не так уж и много…**

— Я прекрасно понимаю, что прежде всего надо упростить все процедуры, связанные с получением виз. В принципе, ведь расстояние не такое и большое, но есть дорогие визы, есть проблемы при пересечении границы. Когда к нам приезжала делегация из Беларуси, все эти вопросы тоже обсуждались. Туризм от этого страдает. Соответствующие сигналы мы, безусловно, совместно с нашими турагентствами передаем в соответствующие министерства. И я надеюсь, что все эти процедуры будут упрощаться в ближайшем будущем. Но это не полномочия мэра.

**— Кстати, а как вы стали мэром? Вот у нас, например, назначение председателей рай- и горисполкомов происходит только с согласия главы государства…**

— У нас есть Совет города, в который входит 41 человек. Есть 8 фракций — 7 партий и одно движение. Мэр избирался во время первого заседания Совета в апреле, хотя до этого проходили разные консультации и согласования. Результат этих согласований — перед вами. Но если бы у нас мэры назначались президентом, то о каких демократических выборах и самоуправлении можно было бы говорить? Впрочем, можно сказать, что и у нас присутствует некоторая централизация. Например, после недавней реорганизации округов большинство функций забрали себе централизованные министерства в Вильнюсе. И от этого местное самоуправление не стало сильней.

**— Насколько возможно на местном уровне налаживание связей с другими странами, городами? Вы как мэр можете устанавливать такие контакты, скажем, с Беларусью?**

— Этому никто не препятствует, мы сотрудничаем с 25 городами, но я не знаю, есть ли у нас город-побратим в Беларуси. Наверное, нет. Хотя знаю, что из российских, украинских городов к нам приезжают на разные городские празднования делегации.

**— А может быть, к вам обращались представители каунасского бизнеса с просьбой помочь установить экономические контакты с нашей страной?**

— Не помню такого случая, но пару лет назад у нас была делегация из Минского горисполкома. Она встречалась с литовскими строителями, которые возводили каунасский торговый центр “Акрополис”. Но это была инициатива из Минска. Насколько я понял, белорусы искали в Каунасе специалистов, которые могли бы реализовать подобные проекты и в Минске. Я знаю, что многие литовские бизнесмены работают в Беларуси.

**— Господин Микайтис, если отойти от политики и экономики… Мэр баскетбольного города случайно в прошлом сам не занимался баскетболом?**

— В школе, на любительском уровне. Но я в свое время серьезно увлекался спортивным ориентированием — пришлось поработать даже на тренерском поприще.

**— У нас чиновников в добровольно-принудительном порядке заставляют бегать на лыжах или устраивать “спортландии” среди государственных ведомств. Не думали, чтобы из чиновников мэрии собрать команду по спортивному ориентированию?**

— Зачем? Каждый должен заниматься своим делом. А в свободное от работы время — человек свободен.

**— Вас узнают на улице?**

— Узнают. Подходят, здороваются, что-то спрашивают.

**— Ходите без охраны?**

— Не только без охраны, но и на работу езжу на собственном автомобиле. Служебный используется только для дальних командировок или во время особенных мероприятий, чтобы не тратить время на парковку.

**— И полиция вас никогда не штрафовала?**

— Такого пока не было. Но не потому, что я мэр, а потому, что не нарушаю правила. Разве может быть иначе?..

**Алесь СИВЫЙ.**

*Каунас—Минск.*

**АФІЦЫЙНА**

*Марыяна ШЧОТКІНА:*

## «Разглядаецца магчымасць выдзялення льготных крэдытаў на вырашэнне праблем бясплоднасці»

*Міністр працы і сацыяльнай абароны **Марыяна Шчоткіна** прадставіла на пасяджэнні прэзідыума Саўміна праграму дэмаграфічнай бяспекі на 2011—2015 гады.*

Як падкрэсліла Шчоткіна, у бліжэйшыя пяць гадоў стаіць задача стварыць умовы для дэмаграфічнага росту і павышэння нараджальнасці, аднак далёка не ўсе сем’і, якія жадаюць мець дзяцей, здольныя рэалізаваць свае жаданні па аб’ектыўных прычынах.

Паводле яе слоў, **у Беларусі 16% сем’яў бясплодныя**, многія з іх хацелі б мець дзяцей, выкарыстоўваючы магчымасць рэпрадуктыўных тэхналогій. Яна адзначыла, што **кожны год у краіне праводзіцца 1,5 тысячы аперацый экстракарпаральнага апладнення (ЭКА**), тым часам вырашэнне праблем бясплоднасці патрабуе ўкладання значных грашовых сродкаў — ад 3 да 12 млн рублёў.

*“Але калі сем’і хочуць мець дзяцей, то дзяржава павінна аказваць нейкую падтрымку такім сем’ям. Цяпер разглядаецца магчымасць выдзялення такім сем’ям ільготных крэдытаў на вырашэнне праблем бясплоднасці”,* — цытуе Шчоткіну БелаПАН.

